# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента аб дысертацыі Сажынай Алены Уладзіміраўны «Полемический дискурс в когнитивно-коммуникативной парадигме (на материале белорусских и британских печатных СМИ)», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.** Дысертацыя Сажынай Алены Уладзіміраўны «Полемический дискурс в когнитивно-коммуникативной парадигме (на материале белорусских и британских печатных СМИ)» адпавядае спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства галіны навукі – філалагічныя навукі, што пацвярджаецца мэтай і задачамі, аб'ектам і прадметам, метадамі і фактычным матэрыялам даследавання, яго вынікамі ў вывучэнні палемічнага дыскурсу беларускіх і брытанскіх друкаваных СМІ на аснове структурна-кампазіцыйных, кагнітыўна-семантычных і камунікатыўна-прагматычных прымет.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі** абумоўлена:

– яе адпаведнасцю антрапацэнтрычнаму і камунікатыўнаму падыходам як важным кірункам сучасных лінгвістычных даследаванняў дыскурсу друкаваных СМІ;

– неабходнасцю распрацоўкі праблемы палемічнасці як рэлевантнай катэгорыі дыскурсу друкаваных СМІ з устанаўленнем яе вызначальных маркераў і тыпаў кантэкстаў, а таксама адрознення ад дыскурсаў навуковай і літаратурнай палемікі;

– важнасцю інтэграцыі існуючых навуковых падыходаў да разгляду палемічнага дыскурсу, патрэбай вывучэння заканамернасцей структурнай арганізацыі палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ і моўнай экспалікацыі яго элементаў;

– устаноўкай на комплекснае даследаванне палемічнага дыскурсу як шматузроўневага лінгвістычнага феномена ў сістэме медыякамунікацыі з рэалізацыяй адпаведных стратэгій і тактык;

– нераспрацаванасцю актуальнай для сучаснага мовазнаўства тэмы палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ на аснове супастаўлення рознаструктурных моў з выяўленнем іх нацыянальнай спецыфікі.

Адзначаныя намі пазіцыі сведчаць пра важнасць і актуальнасць праведзенага Сажынай А. У. даследавання для параўнальна-гістарычнага, тыпалагічнага і супастаўляльнага мовазнаўства, у прыватнасці, для развіцця кагнітыўнай лінгвістыкі і лінгвапрагматыкі, медыялінгвістыкі і функцыянальнай граматыкі. Даследаванне безумоўна актуальнае для сучаснай моўнай практыкі ў сферы стылістыкі і дыскурсіўнай практыкі.

**3. Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Атрыманыя саіскальнікам вынікі даследавання і навуковыя палажэнні, якія выносяцца на абарону, з'яўляюцца, бясспрэчна, новымі і сведчаць аб фарміраванні ў мовазнаўстве напрамку даследаванняў кагнітыўна-камунікатыўнай прасторы медыя ў розных лінгвістычных аспектах. Гэта пацвярджаецца арыгінальнасцю і навізной пастаўленай у даследаванні навуковай мэты і комплекснасцю задач, важнасцю аб'екта і прадмета, што істотна для аб'ектыўнай ацэнкі палемічнасці, а таксама разумення адметнасці яе праяўлення ў разнажанравых беларускіх і брытанскіх публіцыстычных тэкстах. Нягледзячы на ранейшыя даследаванні палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ з боку моўных асаблівасцей палемічнага тэксту, яго структурна-зместавай арганізацыі, лінгвастылістычных параметраў, катэгорыя палемічнасці дыскурсу друкаваных СМІ атрымлівае больш поўнае асвятленне на аснове вызначэння яе ключавых прымет, пэўных тыпаў кантэкстаў, заканамернасцей структурнай арганізацыі ў кірунку кагнітыўна-камунікатыўнай праблематыкі менавіта ў дысертацыі Сажынай А.У.

Супастаўляльнае вывучэнне праблем моўнай рэпрэзентацыі катэгорый дыскурсу, кагнітыўнай семантыкі і лінгвапрагматыкі дазволіла аўтару дысертацыі сфармуляваць наступныя навукова значныя палажэнні і вывады на аснове:

– абгрунтавання спецыфікі палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ і выяўлення асаблівасцей структурна-кампазіцыйных блокаў публіцыстычнага тэксту з улікам кагнітыўна-семантычных і камунікатыўна-прагматычных прымет палемічнага кампанента (першае і другое палажэнні, вынесеныя на абарону);

– вызначэння індэксаў шчыльнасці, інтэнсіўнасці і выразнасці структурна-кампазіцыйных, кагнітыўна-семантычных і камунікатыўна-прагматычных прымет і сярэдняга інтэгральнага індэкса палемічнасці дыскурсу (трэцяе палажэнне, вынесенае на абарону);

– устанаўлення канцэптуальнай арганізацыі палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ з вербалізатарамі канцэптуальнай дамінанты і яе складнікаў-канцэптаў (чацвёртае палажэнне, вынесенае на абарону);

– выяўлення палявой структуры палемічнага дыскурсу з жанрамі зон ядра, бліжняй і дальняй перыферыі, сістэматызацыі моўных эксплікантаў (з падрабязнымі колькаснымі дадзенымі) дыскурснага, міжжанравага і ўнутрыжанравага ўзроўняў кагнітыўна-камунікатыўнай прасторы палемічнага дыскурсу (пятае палажэнне, вынесенае на абарону);

– вылучэння асноўных стратэгій катэгорыі палемічнасці і мэты дыскурсу друкаваных СМІ як складнікаў макрастратэгіі партыцыпацыі ў ядры, бліжняй і дальняй перыферыях дыскурсу і моўных сродкаў іх рэалізацыі (шостае палажэнне, вынесенае на абарону);

– стварэння структуры кагнітыўна-камунікатыўнай мадэлі палемічнага дыскурсу з паслядоўнай і ступеньчатай схемамі разгортвання камунікацыі (сёмае палажэнне, вынесенае на абарону).

Усе вынесеныя на абарону палажэнні знаходзяць развіццё і абгрунтаванне ў тэксце дысертацыі, ілюструюцца змястоўным фактычным матэрыялам, вызначаюцца навізной.

## 4. Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі

Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый забяспечваецца паўнатой і надзейнасцю фактaлагічнай базы даследавання. У дысертацыі на высокім навуковым узроўні даследаваны прэзентатыўны корпус друкаваных публіцыстычных тэкстаў: 6000 тэкстаў на рускай мове (9530 друкаваных лістоў) і 6000 тэкстаў на англійскай мове (9524 друкаваныя лісты), апублікаваных у беларускай і брытанскай прэсе за перыяд з 2008 па 2024 гг.

Аналіз фактычнага матэрыялу ажыццёўлены на базе распрацаванай аўтарам дысертацыі методыкі кагнітыўна-камунікатыўнага падыходу, аўтарскай сістэмы разліку сярэдняга інтэгральнага індэкса і алгарытма параметрызацыі.

Тэарэтычнай базай, якая забяспечвае высокую ступень абгрунтаванасці і верагоднасці вынікаў дысертацыі, з’яўляецца спіс выкарыстанай навуковай літаратуры па праблеме даследавання (усяго 310 пазіцый, у тым ліку працы на замежнай мове).

## 5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні

Вынікі даследавання Сажынай А.У. істотныя для пашырэння і ўдакладнення навуковых ведаў аб палемічнасці публіцыстычнага дыскурсу, яго структурнай арганізацыі і моўнага выражэння, для дапаўнення наяўных уяўленняў аб кагнітыўна-камунікатыўным аспекце розных тыпаў тэкстаў з палемічным кампанентам і выяўлення іх канцэптуальных дамінант. Яны сведчаць пра новы падыход да разгляду спецыфікацыі палемічнага дыскурсу і яго вылучэння з дыскурсаў навуковай, літаратурнай, палітычнай палемікі. Аўтарам дысертацыі прапанавана кагнітыўна-камунікатыўная мадэль палемічнага дыскурсу беларускіх і брытанскіх СМІ з выяўленнем адпаведнай нацыянальнай спецыфікі; ахарактарызаваны спосабы рэпрэзентацыі дамінанты палемічнага дыскурсу сродкамі рускай і англійскай моў; устаноўлены агульныя і адрознівальныя рысы тактыка-стратэгічнай рэалізацыі палемічнага дыскурсу ў абедзвюх мовах.

Дысертацыя Сажынай А.У. становіцца важнай тэарэтычнай асновай для далейшага развіцця асноўных канцэпцый кагнітыўнай лінгвістыкі і прагмалінгвістыкі, істотна паглыбляе разуменне спецыфікі дыялагічнага

ўзаемадзеяння адрасанта і адрасата ва ўмовах дыстантнага кантакту палемічнага поля, аб'ектывуе камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі рэгулявання і трансфармацыі вербальных паводзін адрасата ў рэалізацыі мэты дыскурсу.

Практычная значнасць дысертацыйнага даследавання відавочная і бясспрэчная. Навуковыя вывады, тэарэтычныя абагульненні і даследаваны фактычны матэрыял знойдуць прымяненне ў галіне не толькі беларускай медыялінгвістыкі, але і ў сферы стылістыкі, функцыянальнай граматыкі, пры стварэнні метадычных рэкамендацый па лінгвістыцы тэксту і дыскурсу, тэорыі міжкультурнай камунікацыі, тэксталогіі і інш.

Матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў сферы вышэйшай адукацыі пры выкладанні канцэптуальных асноў сучаснай лінгвістыкі, асноўных напрамкаў сучаснай лінгвістыкі, дыскурсіўнай практыкі, уводзін у рамана-германскую філалогію, спецкурсаў і спецсемінараў па медыялінгвістыцы, пры напісанні курсавых і дыпломных работ, магістарскіх дысертацый і кваліфікацыйных даследаванняў.

Эканамічная значнасць дысертацыйнай працы Сажынай А.У. пацвярджаецца скіраванасцю яе матэрыялаў на забеспячэнне патрэб сучаснай медыялінгвістыкі ў Рэспубліцы Беларусь, што пасадзейнічае аптымізацыі грашовых сродкаў пры выданні вучэбных дапаможнікаў па дыскурс-аналізе і стылістыцы, асацыятыўнага слоўніка палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ.

Дысертацыйнае даследаванне Сажынай А.У. мае і сацыяльна-культурную значнасць, паколькі прапанаваная саіскальнікам методыка комплекснага аналізу і індэксавання палемічнага кампанента дыскурсу можа выкарыстоўвацца беларускімі журналістамі пры падрыхтоўцы разнажанравых матэрыялаў, што паспрыяе павышэнню прэзентатыўнага ўзроўню беларускіх СМІ і пашырэнню аўдыторыі, уключанай у дыялагічны працэс праз палеміку, дыскусію, спрэчку.

## 6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання Сажынай А.У. знайшлі поўнае адлюстраванне ў 84 публікацыях, у тым ліку 1 манаграфіі, 4 частках у калектыўных манаграфіях, 17 артыкулах у беларускіх рэцэнзаваных выданнях, 2 артыкулах у замежных навуковых выданнях, што адпавядае п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў.

Неабходна адзначыць і высокую ступень апрабацыі вынікаў даследавання, якія абмяркоўваліся на 37 навуковых канферэнцыях у Беларусі і за яе межамі, а таксама адлюстраваны ў 23 артыкулах зборнікаў навуковых прац. Адзін артыкул у рэцэнзаваным навуковым часопісе выкананы ў суаўтарстве. Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі.

## 7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата поўнасцю адпавядае патрабаванням дзейнай Інструкцыі па афармленні дысертацыі, аўтарэферата і

публікацый па тэме дысертацыі. Дысертацыя і аўтарэферат напісаны ўзорнай рускай мовай з карэктным выкарыстаннем навуковага стылю, з правільным і абгрунтаваным прымяненнем метамовы сучаснага мовазнаўства.

**8. Заўвагі па дысертацыі**

Пры прачытанні работы ўзнік шэраг пытанняў і заўваг, якія ўказваюць не столькі на недахопы дысертацыі, а з'яўляюцца разважаннямі дыскусійнага характару.

1. Аўтар даследавання разглядае палемічны дыскурс як сукупнасць разнажанравых тэкстаў, у кожным з якіх прысутнічае палемічны кампанент са структурна-кампазіцыйнымі, кагнітыўна-семантычнымі і камунікатыўна-прагматычнымі прыметамі (с. 29). Паняцце «палемічны кампанент», такім чынам, звязваецца непасрэдна з тэкстам. Аднак на с. 8, 10, 11, 48, 49 і інш. палемічны кампанент адносіцца і да дыскурсу. У такім выпадку Сажына А.У. атаясамлівае палемічны кампанент тэксту і палемічны кампанент дыскурсу, хоць дыскурс можна разглядаць у вузкім і шырокім аспекце. У вузкім дыскурс уяўляецца як маўленчы вынік камунікатыўнага дзеяння, г. зн. вербальны прадукт такога дзеяння. У шырокім – гэта комплексная камунікатыўная падзея паміж адрасантам і адрасатам у працэсе камунікатыўнага дзеяння ў пэўным кантэксце (тэмпаральным, прасторавым і інш.). На наш погляд, патрабуе размежавання палемічны кампанент аднаго тэксту і дыскурсу.

2. У дысертацыі на с. 54–57 і с. 76–82 пададзена дакладная методыка правядзення псіхалінгвістычнага эксперымента і яго вынікі. Вынікі ёсць і ў дадатку А «Семный состав полемического компонента дискурса белорусских и британских печатных СМИ» на с. 265–276. Аднак у даследаванні адсутнічае тлумачэнне ступені важнасці менавіта гэтай методыкі для вывучэння палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ і выяўлення яго асаблівасцей. На наш погляд, вызначэнне кагнітыўна-семантычнай прыметы палемічнага кампанента карэктна было б абмежаваць выяўленнем актантаў і сірканстантаў з узуальнымі семамі, а пры разліку індэкса інтэнсіўнасці не ўлічваць аказіянальных сем, паколькі разглядаецца палемічны кампанент **тэксту**, а не асацыяцыі рэспандэнтаў, і формула гэтага індэкса прапануецца менавіта для тэксту, а не дыскурсу (с. 53).

3. На с. 90 і далей аўтар піша пра вербалізацыю канцэптаў праз сіміляры, пад якімі дысертант разумее атрыманыя ў працэсе накіраванага асацыятыўнага эксперымента намінатыўныя адзінкі на аснове інтуітыўнай ацэнкі семантычнай блізкасці паміж асацыятамі і канцэптамі ў палемічным дыскурсе друкаваных СМІ. Пры гэтым на с. 95 аўтар заўважае: «В вербализации концептов главная роль отводится прямой номинации, которая, наряду с симилярами, устойчивыми словосочетаниями, контекстуальными синонимами, метафорическими номинациями, участвует в языковой репрезентации концептуальной организации исследуемого дискурса». Хочацца ўдакладніць, у чым заключаўся асацыятыўны эксперымент і якія

этапы былі прадугледжаны менавіта на этапе вербалізацыі канцэптаў? Чаму, акрамя відавочных моўных экспплікатараў, спатрэбіўся зварот да асэнсавання і падліку сімілярaў толькі некаторых канцэптаў – складнікаў канцэптасферы "палемічнасць"?

4. Як вядома, існуе стратэгія дыялагізацыі, якая выкарыстоўваецца ў камунікацыі для стварэння больш актыўнага і інтэрактыўнага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі дыялогу. Яна абумоўлівае не толькі перадачу інфармацыі, але і прыцягненне сумоўцы ў абмеркаванне, актывізацыю яго меркавання і рэакцыі. Асноўная мэта дыялагізацыі – устанаўленне і падтрымка кантакту, дасягненне ўзаемаразумення і больш глыбокага пранікнення ў тэму. Пры разглядзе камунікатыўнасці тэксту неабходна ўлічваць паняцце дыялагічнасці, або дыялагізацыі (гэтыя тэрміны, на думку Кожынай М.М., сінанімічныя), якое даследуецца ў камунікатыўнай лінгвістыцы і функцыянальнай стылістыцы. Думкі Бахціна М.М. аб універсальнасці дыялагічных адносін, выказаныя яшчэ на пачатку XX ст., актуалізаваліся ў канцэпцыях філосафаў і псіхолагаў, а таксама паўплывалі на лінгвістычныя даследаванні. Дыялог пранікае ў маналагічнае маўленне на ўзроўні змены сэнсавых пазіцый як выразнікаў пунктаў гледжання, пэўнага разумення з'яў і падзей. У дыялогу могуць адлюстроўвацца не толькі дзве пазіцыі розных суб'ектаў, але і аднаго, што дазваляе разглядаць унутраны дыялог як узаемадзеянне падчас супрацьлеглых поглядаў асобы. Дыялагічныя адносіны не супадаюць з адносінамі паміж рэплікамі рэальнага дыялогу – яны больш шырокія, разнастайныя і складаныя.

На с. 158 дысертацыйнага даследавання Сажына А.У. адзначае, што «полемичность дискурса печатных СМИ, реализуемая через дискуссию, спор, дебаты и т. д. в жанрах, предопределяет включение адресата в совместный поиск решения возникшей в обществе проблемы. Тем самым видоизменяется лингвопрагматический вектор дискурса, и ключевая роль отводится стратегии партиципации (соучастия)». У сувязі з гэтым узнікае пытанне: у чым заключаецца адрозненне стратэгіі дыялагізацыі ад стратэгіі партыцыпацыі? Паколькі паняцце дыялагізацыі шырокае і разнастайнае, то, на наш погляд, яго і варта было б ужываць у першую чаргу.

5. У даследаванні на с. 202 Сажына А.У. адзначае, што «выстраиваемая модель, с одной стороны, включает в себя линейные аспекты коммуникации, когда на полемическую публикацию поступают отклики читателей или публикации других журналистов. С другой стороны, она также представлена интеракционными аспектами, предполагающими наличие этапов стимулирования и ответной реакции в ходе дистантного взаимодействия участников полемического дискурса печатных СМИ, в результате которого имеет место выражение согласия/несогласия, критики в адрес автора публикации и т. д.». У чым жа тады заключаюцца інтэракцыйныя аспекты і ў чым іх адрозненне ад лінейных аспектаў у прапанаванай мадэлі? І ці варта было іх адасабляць у дысертацыі?

6. У п. 7 Заключэння (с. 215) аўтар дысертацыйнага даследавання піша пра дзве схемы кагнітыўна-камунікатыўнай мадэлі палемічнага дыскурсу

друкаваных СМІ: *паслядоўнай* і *ступеньчатай*. Аднак гэтымі схемамі не вычэрпваецца мадэль. Неабходна было б адзначыць іншыя магчымыя схемы разгортвання камунікацыі. І чым тады дэтэрмінуецца іх наяўнасць або адсутнасць?

Прыведзеныя заўвагі і пытанні, як можна бачыць, маюць прыватны і дыскусійны характар і не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку дысертацыі Сажынай А.У.

**9. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Верыфікаванасць і абгрунтаванасць асноўных палажэнняў і высадаў дысертацыі Сажынай А.У. не выклікаюць сумненняў, навуковая навізна працы, яе практычная і сацыяльна-культурная значнасць таксама бясспрэчныя. Карэктнасць і аб'ектыўнасць фактычнага матэрыялу, навуковы ўзровень і паўната яго інтэрпрэтацыі з'яўляюцца высокімі. Мэта работы дасягнута, пастаўленыя задачы вырашаны. Актуальнасць і навізна атрыманых вынікаў не выклікае сумненняў. Навуковая вартасць праведзенага даследавання высокая.

Змест і навукова-тэарэтычны ўзровень дысертацыйнага даследавання, навуковая значнасць, абгрунтаванасць і безумоўная верагоднасць атрыманых вынікаў сведчаць пра тое, што навуковая кваліфікацыя Сажынай А.У. адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да саіскальніка вучонай ступені доктара філалагічных навук паводле п. 19 і 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў.

**10. Заключэнне**

Лічу, што дысертацыя Сажынай А.У. «Полемический дискурс в когнитивно-коммуникативной парадигме (на материале белорусских и британских печатных СМИ)» з'яўляецца самастойным і завершаным навуковым даследаваннем, выкананым на арыгінальным фактычным матэрыяле. Атрыманыя ў дысертацыі вынікі з'яўляюцца новымі і абгрунтаванымі, важнымі для далейшай распрацоўкі праблем палемічнага дыскурсу. Прадстаўленая да абароны дысертацыя адпавядае патрабаванням пунктаў 19 і 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук, а яе аўтар Сажына Алена Уладзіміраўна заслугоўвае прысуджэння ступені доктара філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства за наступныя навуковыя вынікі:

– распрацоўку комплекснай методыкі кагнітыўна-камунікатыўнага аналізу рускамоўнага і англамоўнага палемічнага дыскурсу, абгрунтаванае ўдакладненне паняцця палемічнасці публіцыстыкі праз структурна-

кампазіцыйныя, кагнітыўна-семантычныя і камунікаўна-прагматычныя прыметы з вызначэннем іх індэксаў шчыльнасці, інтэнсіўнасці і выразнасці, што спрыяе стварэнню новых падыходаў да аналізу палемічнага дыскурсу ў сістэме медыякамунікацыі і развіццю канцэпцый кагнітыўнай лінгвістыкі і прагмалінгвістыкі;

– устанаўленне асаблівасцей канцэптуальнай арганізацыі палемічнага дыскурсу беларускіх і брытанскіх СМІ на аснове канцэптуальнай дамінанты, пабудовы яе намінатыўнага поля з дапамогай эксперыментальных методык і аналізу тэкстаў друкаваных СМІ; вызначэнне ключавых кагнітыўных прымет ядра і перыферыі канцэптуальнай дамінанты ў абедзвюх мовах, моўных вербалізатараў найбольш актуальных канцэптаў (прамая намінацыя, кантэкстуальныя сінонімы, метафарычныя намінацыі, сіміляры, устойлівыя спалучэнні, сінтагматычная сувязь намінатыўных ужыванняў з дзеясловамі-маркерамі існавання канцэптаў і іх сувязі з працэсамі ў свеце і грамадстве);

– выяўленне спосабаў эксплікацыі ключавых інтэнцый жанраў зон ядзернай, бліжняй і дальняй перыферыі палемічных публікацый, раскрыццё моўных асаблівасцей адрасанта камунікацыі праз эматыўна-ацэначную лексіку, асабовыя займеннікі, дзеясловы інтэлектуальнай і маўленчай дзейнасці, разнастайныя формы пытальных канструкцый, аргументатыўныя схемы і раскрыццё моўных асаблівасцей адрасата праз прамыя і ўскосныя маўленчыя акты з іх эксплікацыяй, схемы аргументатыўнага разгортвання ў беларускіх і брытанскіх друкаваных СМІ;

– апісанне магістральнай стратэгіі партыцыпацыі на аснове лексіка-граматычных сродкаў эксплікацыі тактык апеляцыі да адрасата, прыцягнення ўвагі, аргументаванага меркавання, кантрастыўнага аналізу, прагназавання, ілюстрацыі, апеляцыі да аўтарытэта, параўнання, стварэння эфекту значнасці падзей і іншых у прыватных стратэгіях устанаўлення кантакту, аргументацыі, ацэнкі, інфармавання;

– выяўленне спецыфікі кагнітыўна-камунікатыўнай мадэлі палемічнага дыскурсу друкаваных СМІ з улікам яе шматступеннасці і з асаблівасцямі разгортвання лінейных і інтэракцыйных аспектаў камунікацыі; вызначэнне палявой структуры мадэлі на аснове ядра, бліжняй і дальняй перыферыі, буфернай зоны; апісанне шматступеньчатага характару мадэлі з паслядоўнай (адлюстраванне асноўнай тэмы ў водгуках чытачоў без прыцягнення дадатковых тэм) і ступеньчатай (раскрыццё пэўнага аспекта асноўнай тэмы з яго абмеркаваннем) схемамі камунікацыі.

Афіцыйны апанент –
доктар філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
ўніверсітэта імя Максіма Танка — Т. Я. Старасценка

05.01.2026

Старасценкі Т. Я.
намеснік начальніка АК БДПУ
С. Б. Лешчанка
05. 01. 2026